**У.Рынкевіч**

# ЯН ЛАПАЦІНСКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск 2011**

УДК 76.035(476)+76.071.1(4Беи)
ББК 85.153(4Беи)-8 Лапацінскі Ян
Р 952

Р э ц э н з е н т ы: Р.Ф.Шаура, доктар мастацтвазнаўства, прафесар; Я.Ф.Шунейка, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**Рынкевіч, У.**
Р 952 Ян Лапацінскі / У.Рынкевіч; дадат. У.Ляскоўскага. – Мінск: БДУКМ, 2011. – с.: іл.

ISBN 978-985-522-020.

Выданне змяшчае матэрыял аб мастацкай творчасці гравёра Яна Лапацінскага – ураджэнца паўночнай Беларусі, прадстаўніка знанага шляхецкага роду – у лёсавызначальны перыяд адраджэння беларускай нацыянальнай ідэі. У навуковы абыходак уводзіцца раней невядомы іканаграфічны і факталагічны матэрыял, які апавядае аб значэнні непрафесійнага мастацтва ў нацыянальнай культуры, у прыватнасці аматарскай друкаванай графікі перыяду канца XVIII – пачатку XIX ст.

Прызначана даследчыкам гісторыі культуры і мастацтва, педагогам, студэнтам і навучэнцам спецыяльных адукацыйных устаноў мастацкага профілю, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца мастацкай спадчынай беларускага народа.

**УДК 76.035(476)+76.071.1(4Беи)**
**ББК 85.153(4Беи)-8 Лапацінскі Ян**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ISBN 978-985-522-020**

© Рынкевіч У.І., 2011
© Ляскоўскі У., дадатак, 2011

**З М Е С Т**

**Уводзіны** ……………………………………………………………………..
У віру гістарычных падзей ……………………………………………………..
Мастак з роду Лапацінскіх ……………………………………………………..
У пошуку мастацкага самавыяўлення ………………………………………
З духоўных крыніц пачатак …………………………………………………….
**Літаратура** …………………………………………………………………...
**Дадатак** ………………………………………………………………………
Род Лапацінскіх герба “Любіч” ……………………………………………..
Радавод Лапацінскіх …………………………………………………………….
Літаратурныя і архіўныя крыніцы ……………………………………………..

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## УВОДЗІНЫ

Калі чалавек хоча зразумець, што ён сабой уяўляе, куды ідзе, што яго чакае ў будучым, ён звяртаецца да сваіх этнічных каранёў, асэнсоўвае мінулае сваёй нацыі.

Напамін славутых імёнаў нашых землякоў – гэта адраджэнне радаводу беларусаў, адна з формаў абуджэння гістарычнай памяці. Веданне культурнай спадчыны сваёй краіны – пачэсны абавязак кожнага грамадзяніна Беларусі, які лічыць сябе сучасным інтэлігентным чалавекам, годным нашчадкам гістарычнай спадчыны продкаў. Усведамленне, што мы "не без роду без племені", веданне сваіх этнічных каранёў і нацыянальнай прыналежнасці, драматычнай гісторыі сваёй дзяржавы надае чалавеку гонар за Радзіму, дазваляе адчуць асабістую далучанасць да матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, створаных народам на працягу многіх стагоддзяў. Беларусы – гэта невялікі, але асобны этнас у сусветным супольніцтве народаў, які на сённяшні дзень, прымаючы да ўвагі неверагодныя калізіі гісторыі, не страціў своеасаблівасці.

Жыццё і творчасць мастака-аматара Яна Нікодэма Лапацінскага (1747–1810) прыцягвае ўвагу гісторыкаў і мастацтвазнаўцаў галоўным чынам у сувязі з наступнымі аспектамі нацыянальнай культурнай гісторыі. Па-першае, Я.Лапацінскі цікавы для нас як прадстаўнік аднаго з выбітных беларускіх шляхецкіх родаў у геакультурным рэгіёне былога Вялікага Княства Літоўскага канца XVIII – пачатку XIX ст. Менавіта ў гэтым сацыяльным слоі ў лёсавызначальны перыяд развіцця беларускай нацыі пачало фарміравацца сацыякультурнае асяроддзе, у якім праз паўстагоддзе працэс адраджэння беларускай нацыянальнай ідэі набудзе рэальныя праявы. Па-другое, у яго гравёрных працах выразна адлюстравалася праблема сувязі народнай выяўленчай традыцыі і прафесіянальных відаў мастацтва, у прыватнасці друкаванай графікі. Знаёмства з сацыяльнай і мастацкай дзейнасцю Я.Лапацінскага дазваляе нам сёння пранікнуць у працэс культурнага жыцця грамадства і асэнсавання свету мастацкіх вобразаў на пераломным этапе гістарычнага шляху беларускай нацыі.

Такім чынам, у навуковы абыходак уводзіцца новы, раней невядомы іканаграфічны і фактагічны матэрыял, якому даецца навуковая ацэнка, што дазваляе паглыбіць распрацоўку культурнага пласта гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва XIX ст. і на новым узроўні ведаў звярнуць увагу на значэнне непрафесійнага мастацтва ў нацыянальнай культуры, якое і на сённяшні дзень не страціла сваёй актуальнасці.

Дадзенае выданне з'яўляецца чарговым з серыі мастацтвазнаўчых выданняў "Графіка XIX стагоддзя", якія маюць на мэце адраджэнне некалі знаных, а з цягам часу амаль забытых імёнаў нашых слаўных землякоў. Яно з'яўляюцца адной з асноўных частак праекта "Ян Лапацінскі", праект прадугледжвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама правядзенне мастацкага пленэру на радзіме мастака і арганізацыю шэрагу публічных мастацкіх выстаў яго ўдзельнікаў.

Збіранне эмпірычнага матэрыялу і выданне дадзенай працы стала магчыма дзякуючы матэрыяльнай падтрымцы Фонду Каса імя Юзафа Мяноўскага (Варшава), Шаркаўшчынскага райвыканкама Віцебскай вобласці і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Аўтар выказвае шчырую падзяку шаркаўшчынскаму краязнаўцу Уладзіславу Канстанцінавічу Ляскоўскаму, які прадаставіў для публікацыі сабраныя і апрацаваныя ім цікавыя дакументальныя звесткі аб родзе Лапацінскіх. Гэты матэрыял (змешчаны ў дадатку дадзенага выдання) красамоўна характарызуе сацыяльна-гістарычныя абставіны, у якіх два стагоддзі таму фарміраваўся інтэлектуальна-творчы пласт беларускай нацыі, адным з прадстаўнікоў якога быў Ян Нікодэм Лапацінскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ВІРУ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ

На гістарычным шляху народа ёсць падзеі, якія карэнным чынам змяняюць лёс нацыі, надаючы своеасаблівасць пэўнаму этапу яе эвалюцыі. Час фарміруе менталітэт народа, вылучае з яго асяроддзя інтэлектуальную, творчую эліту грамадства. У дзейнасці яе лепшых прадстаўнікоў – неардынарных творчых асоб свайго часу – найбольш ярка праяўляецца прагрэсіўная сацыяльная пазіцыя, да іх найперш прыходзіць асэнсаванне этнічнай прыналежнасці, фарміруецца нацыянальная самасвядомасць, нараджаюцца перадавыя ідэі навукі, культуры і мастацтва. Да кагорты беларускай інтэлігенцыі другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. належаў і Ян Нікодэм Лапацінскі.

Аб Лапацінскім-гравёры вядома няшмат, хаця яго імя трапіла ў поле зроку калекцыянераў і даследчыкаў мастацтва яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Кароткія звесткі аб яго творчасці змясцілі некаторыя польскія спецыяльныя даведнікі XIX ст. [17; 20; 22]. У савецкі даваенны час на хвалі ўзрастання інтарэсу да нацыянальнай спадчыны праявілі цікавасць да асобы мастака беларускія даследчыкі мастацтва[1]. Але завершанага выгляду, нават у форме артыкула, тады даследаванне не атрымала. У 1960-х гг. згадвае аб Я.Лапацінскім у сваіх працах беларускі мастацтвазнаўца М.Кацэр [4]. Больш шырокая інфармацыя аб творчай дзейнасці Я.Лапацінскага з'явілася ў сярэдзіне 1980-х гг. у "Слоўніку мастакоў польскіх" [16] . Кароткія звесткі агульнага характару аб родзе Лапацінскіх, у тым ліку і Яне Лапацінскім, змяшчаюць некаторыя сучасныя польскія і беларускія энцыклапедычныя выданні [17, с. 7].

Найбольш каштоўны іканаграфічны матэрыял творчай спадчыны Я.Лапацінскага знаходзіцца ў альбомным выданні "Помнікі нацыянальнага гравёрства" [19]. Яно было ўкладзена і выдадзена на аснове асабістай калекцыі гравюр і гравёрных дошак графа Канстанціна Тышкевіча, што знаходзілася ў Лагойскай бібліятэцы[2]. Сярод эстампаў і гравюрных дошак іншых тагачасных беларускіх гравёраў тут змешчаны таксама арыгінальныя гравюры Я.Лапацінскага. Адна гравюра, якая атрыбутавана як "Аўтапартрэт Я.Лапацінскага", выяўлена намі ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея ў Варшаве (NMW).

Час жыцця і творчасці Я.Лапацінскага прыпадае на гістарычны адрэзак, багаты на лёсавызначальныя падзеі ў жыцці беларусаў. У лаканічнай форме пазначым асноўныя моманты сацыяльна-гістарычных абставінаў, якія адыгралі вызначальную ролю ў культурных працэсах на Беларусі другой паловы XVIII – пачатку XIX ст.

---

[1] Аб Нікадзіме Лапачынскім (мабыць, Нікодэме Лапацінскім. – У.Р.) узгадваў у сваіх неапублікаваных нататках беларускі мастацтвазнаўца С.Палеес (Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва – БДАМЛіМ. Ф. 382. Воп. 1. Спр. 442. Арк. 10).

[2] Бібліятэка разам з этнаграфічным музеем, створаным старэйшым братам Канстанціна Еўстафіем Тышкевічам, з'яўлялася адным з найбуйнейшых навукова-культурных асяродкаў тагачаснай Беларусі. Сярод трох тысяч кніг, сабраных у бібліятэцы музея, там захоўвалася каля 500 старажытных помнікаў кнігадрукавання, а таксама рукапісы, геаграфічныя карты, граматы і шмат іншых каштоўных дакументаў і твораў мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй шэсць губерній былога Вялікага Княства Літоўскага (Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская, Ковенская, Віленская) цалкам адышлі да Расіі, атрымалі назву Паўночна-Заходні край Расійскай імперыі. Для карэннага насельніцтва ў сацыяльна-гістарычных адносінах гэтыя перамены азначалі тое, што двухсотгадовы перыяд паланізацыі змяніўся не менш складаным перыядам русіфікацыі беларускай культуры. Як пацвердзіла гісторыя, Расія імкнулася надаць гэтаму краю рускі выгляд, чужыя новаўводзіны і парадкі. Беларусь у наступнае стагоддзе не стала калоніяй, але анексія этнічных беларускіх тэрыторый Расіяй з усімі палітычнымі наступствамі была яўная [13, с. 88].

Храналагічна перыяд, які мы разглядаем, адпавядае пачатку першага этапу шляхецкага вызваленчага руху на Беларусі (1794–1863) [2, с. 15]. Характэрнай яго рысай з'яўляецца тое, што ва ўмовах нацыянальна-культурнага ўціску менавіта ў шляхецкім асяродку (не толькі беларускім) на аснове росту этнічнай свядомасці распачынаецца працэс фарміравання ідэйнай супольнасці беларусаў, закладваюцца асновы адраджэння беларускай нацыянальнай ідэі. Уздым навуковай цікавасці да мінуўшчыны ВКЛ і адпаведна да гісторыі беларускага этнасу праявіўся ў рэчышчы ідэі аднаўлення Рэчы Паспалітай [13, с. 66].

Геаграфічнае палажэнне беларускіх зямель, якое характарызавалася сваім буферным тэрытарыяльным становішчам паміж Захадам і Усходам, вызначала асаблівасці развіцця беларускай культуры. На пачатку XIX ст. "Беларусь апынулася паміж Польшчай, якая ўвасабляла заходнюю цывілізацыю і яе вольнасці, і Расіяй, якая ўяўляла сабой усходні, азіяцкі, дэспатызм" [13, с. 86]. Узаемадзеянне культур народаў заходне- і ўсходнееўрапейскіх краін праяўлялася ў розных сферах сацыяльнага жыцця: эканамічнай, рэлігійна-канфэсійнай, культурна-адукацыйнай.

Новыя эстэтычныя павевы, змяненне стыляў і перадавыя тэхналогіі ў мастацтве (у графіцы ў першую чаргу), якія распаўсюджваліся з Захаду на Усход, праходзілі праз беларуска-літоўскія землі. Гэта садзейнічала актывізацыі дзейнасці ў нашым краі ўжо існуючых культурных цэнтраў і генерыравала ўзнікненне новых асяродкаў мастацтва. Менавіта на гэты перыяд выпадае фарміраванне ў нашым краі сістэмы мастацкай адукацыі з цэнтрам у Віленскім універсітэце. Знакавай падзеяй у развіцці графічнага мастацтва стала адкрыццё кафедры гравюры ў 1805 г. на аддзяленні прыгожых мастацтваў дадаткова да ўжо існуючых мастацкіх кафедраў малюнка і жывапісу, скульптуры. Такім чынам, працэс дыферэнцыяцыі мастацтва на прафесійнае і народнае на той час узмацніўся.

Ілюстраваныя кнігі, эстампы, друкаваныя народныя карцінкі (у асноўным каталіцкія, "польскія"), выкананыя ў тэхніцы металагравюры – медзярыт і афорт, якія прыходзілі з Захаду, мелі хаджэнне на Беларусі разам з ксілаграфічнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гравюрамі ўсходнеславянскага паходжання, з кірылічнымі надпісамі праваслаўнага канона. Мясцовыя друкарні (напрыклад, адна са старэйшых у нашым краі друкарня Свята-Духава манастыра ў Вільні) выдавалі для шырокага распаўсюджвання друкаваную прадукцыю на рускай, польскай, грэцкай і іншых мовах. Мастацкае аздабленне каталіцкіх і ўніяцкіх выданняў часта рабілі адны і тыя ж мастакі [14, с. 73]. Узоры графічнага мастацтва розных краін асімілявaліся на беларускай культурнай глебе і знаходзілі свайго спажыўца.

Інтэлектуальнай элітай нашага краю быў адносна нешматлікі шэраг ліцвінскай інтэлігенцыі. Гэта былі людзі, якія лічылі сябе ліцвінамі (беларусамі) – па паходжанні, палякамі – па грамадзянству і адпаведна па нацыянальнасці. Ліцвінамі лічылі сябе Т.Касцюшка[3], А.Міцкевіч[4], А.Нарушэвіч[5], С.Юндзіл[6], У.Сыракомля,[7] С.Манюшка[8] і многа іншых слаўных сыноў Бацькаўшчыны. Ян Лапацінскі таксама належаў да гэтай кагорты адукаваных асоб. Насельніцтва беларускіх гарадоў і мястэчак заходніх рэгіёнаў, таксама як і прафесары Віленскага ўніверсітэта, тутэйшыя па паходжанні, карысталася польскай мовай, якая доўгі час была дзяржаўнай на беларускіх землях. Але гэтая акалічнасць не прыніжае значэння іх унёску ў беларускае культурнае адраджэнне. Фарміраваўся асобы тып беларускага патрыёта, ад якога распачынаўся працэс нацыянальнага самаўсведамлення, аднаўлення беларускай пісьменнасці, дзейнасці вучоных мясцовага паходжання ў галіне гісторыі, этнаграфіі, археалогіі і іншых навук. У канцы XVIII – першай палове XIX ст. пачынае набіраць дынаміку працэс адраджэння беларускай нацыянальнай ідэі. Нацыянальнае адраджэнне беларусаў праяўлялася ў навуковай, літаратурнай, культурна-асветніцкай дзейнасці лепшых прадстаўнікоў краёвай шляхты і духавенства.

Беларуская творчая інтэлігенцыя, якая складала вышэйшы сацыяльны слой грамадства, з цяжкасцю пераносіла гістарычныя зломы. Разам з тым, захоўваючы шляхецкі гонар, мясцовая шляхта адносілася да палітычных змен як да гістарычнай рэальнасці, перадаючы нашчадкам запавет служыць дзяржаве верай і праўдай, кладучы на алтар любові да роднага краю і свайго народу ўсе сілы і Богам дадзены ім талент. Менавіта такімі жыццёвымі прынцыпамі сілкаваліся

[3] Касцюшка Андрэй Тадэвуш Банавентура (1746–1817) – кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г., ваенны і палітычны дзеяч. Нарадзіўся ў маёнтку Мерачоўшчына (цяпер Івацэвіцкі раён).

[4] Міцкевіч Адам (1798–1855) – паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Нарадзіўся ў Завоссі (цяпер Баранавіцкі раён Брэсцкай вобл.).

[5] Нарушэвіч Адам Тадэвуш Станіслаў (1733–1796) – гісторык, паэт. Нарадзіўся ў м. Лагішын Пінскага павету.

[6] Юндзіл Станіслаў Баніфацы (1761–1847) – прафесар, прыродазнавец, загадчык кафедры гісторыі прыроды Віленскага ўніверсітэта. Нарадзіўся ў вёсцы Ясенцы Лідскага павету (цяпер Воранаўскі раён).

[7] Сыракомля (Кандратовіч) Уладзіслаў (1823–1862) – літаратар. Нарадзіўся ў фальварку Смольгаў Бабруйскага павету (цяпер Любанскі раён).

[8] Манюшка Станіслаў (1819–1872) – кампазітар, дырыжор, педагог. Нарадзіўся ў фальварку Убель (цяпер Чэрвенскі раён).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на працягу стагоддзяў творчыя асобы са старажытных родаў на беларускіх землях: Сапегаў, Радзівілаў, Ельскіх, Ходзькаў, Агінскіх, таксама Лапацінскіх.

У асяроддзі беларускага шляхецтва, асабліва сярод нашчадкаў старажытных родаў, якое месцілася ў паўночна-заходнім рэгіёне (на Дзісненшчыне, Браслаўшчыне, Міёршчыне), уладарыў патрыятычны настальгічны настрой аб адыходзячых у гісторыю славутых часах магутнай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага. Аднак не толькі праявамі патрыятызму былі знаныя прадстаўнікі шляхецкіх родаў, яны вылучаліся добрай адукаванасцю, шырокім кругаглядам і творчымі памкненнямі. Ян Нікодэм з роду Лапацінскіх жыў у плыні свайго часу – паважнага да навукі ды адукацыі веку Асветніцтва.

## МАСТАК З РОДУ ЛАПАЦІНСКІХ

Ян Нікодэм Лапацінскі (Łopaciński Jan Nikodem, 1747–1810) быў асобай вядомай і паважанай у шляхецкім асяроддзі. Ён займаў высокія адміністрацыйныя пасады, да таго ж меў натуру тонкую, артыстычную, быў мецэнатам і калекцыянерам мастацтва. А таксама ён быў вядомы як заўзяты аматар-мастак: займаўся малюнкам, дробнай пластыкай і гравіраваннем па медзі. Дзякуючы гравюрам захапленне Яна Лапацінскага было вядома калекцыянерам і даследчыкам XIX ст. і імя яго ўвайшло ў гісторыю беларускага мастацтва.

Вывучэнне генеалогіі роду Лапацінскіх дазваляе нам больш дакладна ўявіць асобу мастака, на якой адбіліся маральныя ўстоі і сацыяльна-культурныя погляды шляхты напачатку новага этапу гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі.

Паводле энцыклапедычных звестак, ён належаў да старажытнага шматразгалінаванага шляхецкага роду Лапацінскіх герба "Любіч". Гэтым прыватным гербам, вядомым з XIV ст., карысталіся больш за 500 родаў, якія жылі на землях Беларусі, Украіны, Літвы, цэнтральных рэгіёнаў Польшчы. Акрамя Лапацінскіх, герб "Любіч" лічылі сваім Жулнеўскія, Незабытоўскія, Радзімінскія і іншыя роды[9].

Прозвішча Лапацінскіх вядома з XV ст., і прыйшло яно на Беларусь з Мазовіі – гістарычных польскіх зямель, якія з утварэннем федэратыўнай дзяржавы Рэч Паспалітая (1569) сталі яе цэнтральным рэгіёнам. За тры стагоддзі сярод Лапацінскіх вылучылася нямала выбітных асоб, якія адыгралі значную ролю ў патрыятычным нацыянальна-вызваленчым руху ў нашым краі, гаспадарчай і культурнай сферах дзейнасці. Сярод іх вайскоўцы, у тым ліку і знакамітыя начальнікі, адзначаныя графскімі тытуламі, ваяводы, паслы сейму, суддзі, гродавыя старосты – людзі высокаадукаваныя, прасякнутыя пачуццём грама-

[9] "Любіч" //Бел. энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск:БелЭн, 1999. – Т. 9. – С. 397.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзянскага абавязку, высокіх маральных якасцей, пачцівасці да сваіх этнічных каранёў і культурных традыцый[10].

З дакументальных крыніц вядома, што ў XV ст. Багдан Лапацінскі, сын каралеўскага двараніна Вільгельма з Лапаціна, які загінуў пад Грунвальдам, перасяліўся ў ВКЛ, дзе атрымаў ад князёў мсціслаўскіх землі (Жалязнікоўскія, Градабіцкія і інш.) і пасаду гродавага старосты мсціслаўскага. Яго сын Юзаф, ротмістр замку мсціслаўскага, заклаў на гэтых землях маёнтак, названы Лапацінам [16, с. 174]. І першы стаў называцца – з Лапаціна Лапацінскі. Пашану да сваёй малой радзімы Ян Лапацінскі пранёс праз усё жыццё, аб чым ужо ў сталым веку ўласнаручна засведчыў надпісам на гравіраваным аўтапартрэце: "*Jan Nikodem z Łopacina Łopacinski"*.

Найбольшую вядомасць род Лапацінскіх набыў у другой палове XVIII – пачатку XIX ст. Славу яму надалі тры сыны Лявона Лапацінскага: Ян Дамінік, Мікалай Тадэвуш і Ігнацы Блажэй.

Сярэдні з братоў, Мікалай Тадэвуш Лапацінскі (1715–1778), бацька Яна Лапацінскага, быў чалавекам вялікага розуму, арыстакратам па натуры і легітымістам па пераканannях. Гадаванец свайго часу, ён добра ведаў лацінскую, французскую, італьянскую, нямецкую мовы. Ліставаўся з многімі дзяржаўнымі дзеячамі Рэчы Паспалітай, з самім каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім. Здольнасць прамоўцы і працавітасць дазволілі яму дасягнуць вялікіх вышынь у веданні юрыспрудэнцыі. Ён неаднойчы абіраўся паслом сейма, займаў пасаду вялікага літоўскага пісара, здолеў атрымаць сенатарскі фатэль ваяводы берасцейскага. Мікалай Тадэвуш, маючы моцны характар і высокія асабістыя дасягненні, прыклаў шмат намаганняў, каб яго сын змог заняць высокае становішча на арыстакратычнай лесвіцы. Разам з тым Яну Лапацінскаму ў цені бацькоўскага аўтарытэту было няпроста захаваць індывідуальнасць і пакінуць свой след у гісторыі.

Нарадзіўся Ян Нікодэм Лапацінскі 15 лістапада 1747 г. [16, с. 174]. Але ёсць і іншая версія адносна даты нараджэння – 1743 г., пазначаны на гравюры, якая лічыцца аўтапартрэтам мастака. Месца яго нараджэння – мястэчка Сар'я (зараз вёска ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці). Праз сто гадоў пасля нараджэння Яна Лапацінскага патомак старажытнага роду Ігнат Лапацінскі пабудаваў Сар'янскі касцёл (1857, архітэктар Г.Шахта) у стылі несапраўднай готыкі, які меркавалася выкарыстоўваць як родавую пахавальню. Велічны вытанчаны сілуэт з чырвонай цэглы як помнік роду Лапацінскіх і па сённяшні дзень узвышаецца над мясцовасцю.

Ян Нікодэм атрымаў неблагую па тым часе адукацыю: вучыўся спачатку ў езуіцкім калегіуме ў Вільні, а з 1758 г. – у езуіцкім калегіуме ў Варшаве. У 1753 г.

[10] Гл. дадатак «Род Лапацінскіх герба "Любіч"».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго бацькі, Мікалай Лапацінскі і Барбара з роду Копцаў, набылі маёнтак у Шаркаўшчыне (Дзіснянскі павет Віцебскай губерні), якая складалася з двух мястэчак: старога (каля 500 жыхароў) і новага (каля 28 хат). Тут былі таксама яўрэйскі малітоўны дом, паштовая станцыя, царква Беззаганнага Зачацця [21, 797]. У канцы 1760-х гг. у мястэчку Лявонпаль (раней Чурылавічы Полацкага ваяводства; перайменаваны ў гонар дзеда, Лявона Лапацінскага) яны пабудавалі шыкоўны белы палац з цэглы ў стылі барока, які напалову агінаў канал, з французскім паркам на дзвюх тэрасах і аранжарэяй, дзе вырошчваліся нават цытрусавыя культуры. У палацы знаходзіліся фамільны архіў, бібліятэка, калекцыя мастацкіх твораў (дзе былі нават чатыры карціны Рубенса), якую працягваў папаўняць і Ян Нікодэм. У час яго гаспадарання ў Лявонпалі была пабудавана драўляная Траецкая царква (1774), а таксама ткацкая мануфактура, майстэрня па вырабу дываноў і капелюшоў, суконная фабрыка. У 1791 г. паводле яго загаду і па яго малюнку ля маёнтка была ўзведзена мемарыяльная мураваная калона ў стылі класіцызму ў гонар першай у Еўропе зафіксаванай пісьмова Канстытуцыі 3 мая 1791 г. – асноўнага закона Рэчы Паспалітай, што сведчыла аб прагрэсіўных сацыяльных поглядах уладальніка маёнтка[11]. У лісце ад 22 жніўня 1791 г. аднаму са сваіх карэспандэнтаў Ян Лапацінскі пісаў: "Задумаў я ўвекавечыць тут, на мяжы Рэчы Паспалітай, перад тварам нашага грознага ворага, вялікую справу Канстытуцыі 3 траўня, у якой ёсць і мая, хоць і сціплая частка. З гэтай мэтай загадаў я вымураваць вялікі слуп паводле майго накіду на адкрытым месцы, амаль над самай Дзвіной, каб ён быў здалёк бачны нашым нешчаслівым братам за кардонам і мацаваў іхнія сэрцы надзеяй". Пазней Лапацінскі перабраўся ў Шаркаўшчыну, якую бацька перадаў яму ў спадчыну, і зрабіў яе сваёй рэзідэнцыяй.

Росквіт Лявонпаля доўжыўся нядоўга. Тамаш Ігнацы, брат Яна Лапацінскага, па невядомай прычыне перанёс усе лявонпальскія зборы ў фамільную рэзідэнцыю ў Сар'ю, дзе, дарэчы, не было мураванага палаца. З таго часу Сар'я стала галоўнай сядзібай Лапацінскіх, Лявонпаль паступова прыходзіў у заняпад, а ў 1831 г. па прычыне ўдзелу Лапацінскіх у паўстанні сядзіба была захоплена казакамі і разрабавана.

Яшчэ ў маладым узросце Ян Лапацінскі заняў пасаду гродавага старосты мсціслаўскага (1767). Гэтая дзяржаўная служба перайшла яму ад бацькі. Яго дзве сястры і тры браты таксама былі добра адукаванымі людзьмі і займалі ў грамадстве важкае становішча, былі ўладальнікамі маёнткаў з вялікімі бібліятэкамі.

---

[11] Падобныя мемарыяльныя калоны ўстанаўліваліся і ў іншых мясцінах Паўночна-Заходняй Беларусі. Яны ўслаўлялі Канстытуцыю Рэчы Паспалітай. Закон скасоўваў унію ВКЛ, але разам з тым ліквідавалася феадальная анархія ў краіне і ствараліся больш спрыяльныя ўмовы для эканамічнага развіцця (Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск, 1985. – С. 227, 310; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск. – 1997. – Т. 4. – С. 334).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ян Нікодэм быў двойчы жанаты. Першай яго жонкай была Алена Агінская, а пасля яе смерці ён ажаніўся з яе роднай сястрой Юзэфай.

З 1772 г. Мсціслаўскае ваяводства было далучана да Расійскай імперыі. Я.Лапацінскі, кавалер ордэнаў св.Станіслава і Белага Арла, апошні мсціслаўскі староста, захаваў свой тытул пажыццёва. Ён быў абраны віцэмаршалкам Галоўнага трыбуналу Вялікага Княства Літоўскага (1776). У зборніку гравюр К.Тышкевіча маецца звестка, што Ян Лапацінскі "быў жыхаром Мінскай губерні і старостам мінскім", але дакументальнага пацвярджэння гэтаму факту пакуль што не выяўлена. К.Тышкевіч у тэксце дапускае недакладнасць адносна года смерці гравёра, гаворачы, што "гравёр гэты памёр у родавым маёнтку ў сваёй вёсцы каля 1807 г." [19, с. 18]. Жыццё Я.Лапацінскі скончыў 13 кастрычніка 1810 г. у Шаркаўшчыне, дзе і быў пахаваны.

## У ПОШУКУ МАСТАЦКАГА САМАВЫЯЎЛЕННЯ

Напрыканцы XVIII ст. пасля вялікіх змен на еўрапейскай геапалітычнай арэне Я.Лапацінскі, адышоўшы ад спраў дзяржаўных і, не па сваёй волі, стаўшы падданым Расійскай імперыі, асеў у сваім маёнтку ў Шаркаўшчыне, аддаўшыся гаспадаранню і мастацкай творчасці. Сёння аб маёнтку напамінаюць толькі рэшткі мураваных гаспадарчых пабудоў ды дрэвы старога парку, што яшчэ захаваўся на ўзгорку ля невялічкага вадаёма.

Ад прыроды Я.Лапацінскі быў надзелены не толькі ясным розумам, але і творчымі здольнасцямі, займаўся ў вольны час прыемным яму мастацтвам, але часцей за ўсё гравіраваннем па металу. Ён не меў мастацкай адукацыі і не быў народным умельцам, выхаваным на фальклорных традыцыях. Гравюры ствараў не дзеля заробку, але для задавальнення духоўнага. Творы яго, у сюжэтна-тэматычнай аснове якіх панавалі рэлігійная тэматыка і правінцыяльны партрэт, па класіфікацыі В.Пракоф'ева, адпавядаюць "сур'ёзнаму" тыпу выяўленчага прымітыву [12, с. 29]. У большасці яны маюць камерны характар і адрасаваліся вузкаму колу родзічаў і знаёмых, а таксама сялянам сваёй вотчыны. Я.Лапацінскага задавальняў статус творцы-аматара – непрафесійнага, самадзейнага гравёра, мастака-самавука. Арыенцірам для яго было прафесійнае мастацтва. На той час гравюра на метале (кропачная, штрыхавая, абрысная) з-за сваёй эксклюзіўнасці прызначэння і складанасці вырабу набыла папулярнасць у мастацкім асяроддзі і была запатрабавана не толькі выдаўцамі кніг, але і аматарамі эстампа, уладальнікамі бібліятэк, калекцыянерамі мастацкіх твораў, шляхціцамі, якія хацелі аздобіць свае маёнткі на сучасны еўрапейскі манер. Прыкметай пазітыўных перамен у развіцці графічнага мастацтва стала з'яўленне ў гарадах спецыялізаваных гравюрных лавак, дзе разам з эстампамі прафесійных гравёраў шырока выстаўляліся народныя карцінкі для масавага спажыўца. Напрыклад, у Вільні гравюр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ную лаўку меў Ізідор Вейс – мясцовы гравёр, першы кіраўнік кабінета гравюры Віленскага ўніверсітэта, пазней ён перадаў яе ў спадчыну свайму сыну [10] .

На землях былога ВКЛ прафесійнае мастацтва, створанае на базе ўніверсітэцкай адукацыі, было распачата з канца XVIII ст. Яно афіцыйна падтрымлівалася расійскай дзяржавай. Традыцыйнае народнае мастацтва развівалася натуральным чынам. Гэтыя дзве плыні мастацкай творчасці існавалі паасобку, але пэўнае ўзаемадзеянне мела месца. Акадэмічная школа прываблівала аматараў мастацкай творчасці рэалістычнасцю адлюстравання. Найбольшаму ўплыву тэндэнцыі арыентацыі на прафесійнае мастацтва падвяргаліся гарадскія мастакі-аматары. Творчыя асобы з асяроддзя інтэлігенцыі – людзі адукаваныя і дасведчаныя ў еўрапейскай культуры – часцей схіляліся да элітарных відаў выяўленчай творчасці, адным з якіх у той час была металагравюра траўленая (афорт) і разцовая (медзярыт, сталярыт). Занятак гравюрай быў настолькі папулярны, што гравіравалі нават некаторыя высокапастаўленыя асобы. Сярод іх, напрыклад, сучаснік Я.Лапацінскага князь Адам Чартарыйскі – міністр замежных спраў Расіі, найбліжэйшы дарадца імператара Аляксандра I і куратар Віленскай адукацыйнай акругі [9]. Гравіраванне мае складаную тэхналогію, патрабуе спецыяльных матэрыялаў і абсталявання, таму было заняткам не танным, даступным толькі заможным. У свецкім асяроддзі гравюра на метале асацыіравалася з высокай еўрапейскай культурай.

Магчыма, Я.Лапацінскі ўпершыню пазнаёміўся з гравёрнай справай у гады вучобы ў Вільні. Тут Ян Нікодэм выканаў некалькі малюнкаў для друкарні Брацтва Святога Духа, дзе сапраўды было чаму павучыцца [16, с. 174]. Гэта было адно са старэйшых выдавецкіх прадпрыемстваў праваслаўнай царквы ВКЛ (XVI–XVIII стст.), выданні якога па ўзроўні мастацкага афармлення належалі да лепшых беларускіх старадрукаў з характэрнымі прыкметамі ўплыву народнай творчасці [14, с. 76, 79]. Але ўсе гравюры Я.Лапацінскага, якія захаваліся да нашага часу, адносяцца да больш позняга перыяду – пачатку XIX ст.

Акрамя абразкоў святых, гаворка аб якіх пойдзе ніжэй, Я.Лапацінскі таксама рабіў ілюстрацыі да падручнікаў [16, с. 174]. Больш за ўсё яго прыцягвала гравіраванне партрэтаў, што цалкам лагічна, бо партрэт на той час быў самым запатрабаваным жанрам выяўленчага мастацтва. Гравюры Я.Лапацінскі ствараў не з жывапісных ці графічных арыгіналаў, як гэта было прынята ў прафесійных гравёраў, а паводле асабістых малюнкаў, што няцяжка заўважыць па прымітыўна нарысаваных партрэтных профілях сваіх родных.

Пры стварэнні гравюр арыентаваўся на найбольш даступныя тагачасныя адбіткі мясцовых гравёраў, на што ўказвае тоеснасць кампазіцыйнага строю і элементаў дэкаратыўнага аздаблення. Сярод паўпрафесійных гравюр другой паловы XVIII ст. шырокай вядомасцю карысталіся гравюры, сабраныя ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

альбоме "Icones familiae ducalis Radivillianae" (1758), аўтарства большасці з якіх прыпісваецца нясвіжскаму граверу Гершы Лейбавічу.

Гравёрныя партрэты родных мастака: бацькі, маці, абедзвюх жонак, дзядзькі Яна Дамініка Лапацінскага, – а таксама і профільны аўтапартрэт складаюць серыю сямейных партрэтаў. У іх адчуваецца стараннасць, імкненне майстра зрабіць партрэтную выяву накшталт сучаснага "фота на ўспамін". Відавочны элементарныя прыёмы: правы або левы профіль без прэтэнзій на пранікнёнасць ва ўнутраны свет чалавека, адчуванне няўпэўненасці малюнка твару і ў валоданні прыёмамі штрыхоўкі і адбору элементаў дэкаратыўнага аздаблення гравюр.

Найбольш характэрныя сямейныя партрэты, аўтапартрэт мастака "Аўтапартрэт скульптара" (медз., надпіс: *"Mamu propria sculpsit"*) і "Партрэт Лапацінскай з Агінскіх" (медзярыт, надпіс: *"Haeres Szarкoviensis sculpsit"*). Гравюры гэтай серыі маюць аднолькавыя дэкаратыўныя элементы ў абрамленні партрэтных рам, відавочна таксама падабенства почырку надпісаў, агульная стылістыка гравіравання. Профільныя партрэты пададзены ў авале на цёмным фоне. Ствараючы партрэты, аўтар найперш меў на мэце адлюстраванне вонкавага падабенства таго, хто партрэтуецца. Таму характэрнай рысай гравюр з'яўляецца дакладнасць і стараннасць выканання. Выкарыстоўваючы эфект святла, мастак канцэнтруе ўвагу на тварах, вылучаючы іх святлом на цёмным фоне. Разам з тым абрамленне партрэта авальнай масіўнай рамай, быццам груба апрацаванай, завершанай вялікім бантам, падказвае, што аўтару не стае прафесійнага густу, а твор яшчэ застаецца ў палоне аматарскай наіўнасці.

Больш высокім мастацкім узроўнем і сармацкім характарам партрэтнага вобраза вылучаецца гравюра "Ян Нікодэм з Лапаціна Лапацінскі " (медз., 13,9 × 8,7, з надпісам: *"Jan Nikodem z Łopacina Łopacinski. Mscisławski y Łozdz: Starosta. Kawaler Or. Pol. Ur. w r. 1743"*). У музейнай атрыбутыцы аўтарства гравюры прыпісваецца Я.Лапацінскаму[12]. Партрэт, які мы разглядаем, не мае ніякага подпісу. Хаця Я.Лапацінскі заўсёды падпісваўся на сваіх работах: "Лапацінскі, староста мсціслаўскі", "У Шаркаўшчыне Лапацінскага старосты работа", "Шаркаўшчынскі гравёр" і да т.п. Святлоценявая распрацоўка аб'ёмнай пластыкі выявы, дэталёвая распрацоўка ўпарадкаваных складак тканіны ўказваюць на тое, што першаўзорам для гравёра быў не натурны малюнак, а невядомы нам жывапісны партрэт. Ставяць пад сумненне аўтарства Я.Лапацінскага адносна дадзенага твора выкарыстанне не характэрнага для мастака трохчацвяртнога ракурсу партрэта, багатае дэкарыраванне рамы, выкананае ў традыцыях барока: умоўна аб'ёмныя архітэктурна-геаметрычныя формы абрамлення партрэта, гірлянды з дубовых лістоў, якія абвіваюць круглую раму партрэта. Пры бакавым асвятленні гэта стварае эфект рэльефнасці выявы. Сумненне ў аўтарстве

[12] Гравюра знаходзіцца ў MNW, Gr. Pol. 2365.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я.Лапацінскага ўзмацняюць і некаторыя іншыя дэталі, у тым ліку разнастайнасць узораў і вытанчанасць штрыхоўкі дэкарыравання архітэктурных элементаў і фону, нарэшце почырк подпісаў. Але больш за ўсё здзіўляе няправільна пазначаны год нараджэння Я.Лапацінскага ("Ur. w R$^{u}$ 1743"). Ці мог зрабіць такую памылку сам Я.Лапацінскі? Тэхніка гравіравання ўказвае на даволі спрактыкаваную руку. Магчыма, партрэт быў выкананы адным з вілінскіх гравёраў. Вядома, што Лапацінскі звяртаўся да паслуг прафесійных гравёраў. Экслібрыс для яго бібліятэкі "Leopoliensi" ў Шаркаўшчыне зрабіў віленскі гравёр Ф.Бальцэвіч, які спецыялізаваўся ў гравюры малых формаў [24, с. 47–48]. Ёсць таксама і іншыя звесткі аб цесных кантактах Я.Лапацінскага з мастакамі. Так, пры двары пана Лапацінскага, мсціслаўскага "капітана", працаваў мастак Анташэўскі (магчыма, Казімір Анташэўскі). Ён распісваў касцёл у Будславе, недалёка ад Шаркаўшчыны, там ён мог жыць у свайго апекуна Яна Нікодэма Лапацінскага [15].

З часоў Ф.Скарыны беларуская станковая гравюра пастаянна звярталася да свецкай тэматыкі. Яна актыўна рэагавала на сучасныя ёй падзеі. Блізкі па мастацкіх характарыстыках да фамільных партрэтаў партрэт Тадэвуша Касцюшкі, выкананы Я.Лапацінскім прыблізна ў той жа час у Шаркаўшчыне, як сведчыць аўтарскі подпіс: "*W Szarkowszczyźnie*". Заўважым, што на пераломе XVIII–XIX стст. асоба Тадэвуша Касцюшкі, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання, была вельмі папулярная сярод патрыятычна скіраванай моладзі. Яго шматлікія мініяцюрныя партрэты насілі ў выглядзе медальёнаў, прышпільвалі да сукенак, шапак, змяшчалі на бранзалетах, табакерках і да т.п. [23, с. 74]. Партрэты і сюжэтныя карціны з вобразам народнага героя паўстання ў вялікай колькасці выконваліся знанымі мастакамі і самавукамі. Таму не дзіўна, што натхненнё на стварэнне партрэтаў Т.Касцюшкі не мінула і Я.Лапацінскага. Няма сумнення, што гравюра была выканана паводле аднаго са шматлікіх тагачасных жывапісных альбо графічных арыгіналаў. Парадны партрэт (профіль управа) са шпагай, адметны выразным светлым сілуэтам на ўмоўна цёмным фоне, быў характэрны для яго больш ранніх партрэтных гравюр, але ў дадзеным выпадку тэхніка малюнка і прыёмы гравіравання больш дасканалыя, чым у ягоных фамільных партрэтах. Аздабляючы круглую раму лаўровымі лістамі, перавязанымі стужкай, выкарыстоўваючы разнастайныя формы штрыха, аўтар імкнуўся надаць эстампу прывабны ўрачысты выгляд. У пэўнай ступені яму гэта ўдалося, хаця ў трактоўцы асобы Т.Касцюшкі ён не пераўзыходзіць рамкі халоднай мемарыяльнай патэтыкі вобраза гістарычнай асобы, застаючыся ў лоне аматарства.

Прывабнай адкрытасці гравюрных вобразаў Я.Лапацінскага садзейнічала сціплае, без залішняга дэкарыравання афармленне гравюр, а таксама манера гравіравання з кароткімі дыяганальнымі і скрыжаванымі штрыхамі, падобная на хуткі алоўкавы рысунак (выява рысамі). Нават пры пэўных хібах тэхнікі вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кanання і наіўным вымалёўванні дэталяў твараў і фігур у гравюрах фамільнай і свецкай тэм разам з простай канстатацыяй вонкавага аблічча персанажа адчуваецца імкненне аўтара да паглыблення ў яго эмацыянальны стан. Але гэта якасць больш выразна праявілася ў гравюрах сакральнай тэматыкі.

З ДУХОЎНЫХ КРЫНІЦ ПАЧАТАК

Асобную групу работ Я.Лапацінскага складаюць гравюры сакральнага зместу: "Святое сямейства" (медз., надпіс: *"Sancta Mater Dei", "Łopaciński, S.M."*), "Маці Божая" (медз., надпіс: *"Najświętsza Marya Matka Jezusa", "W Szarkowszczyźnie Łopacińskiego S-ty, roboty dla swoich włościan"*), "Ісус Хрыстос" (медз., надпіс: *"Jezus Chrystus Syn Boga naszego. W Szarkowszczyźnie Łopacińskiego S-ty roboty dła swoich włościan"*), "Тры пакутнікі" (медз., надпіс: *"S.Fulgentius M.S. Junmdinus M.S. Teofilus M. Ich relikwije w kaplicy dworu Szarkowskiego złożone w roku 1803"*), "Святы пакутнік Інакенці" (медз., надпіс: *"S.Innocentius M., ktorego ciało z ampułką krwi złożone w kościele parafijalnym Dryświackim roku 1803"*) [ 25 ]. Мяркуючы па азначаных датах на некаторых з іх і ідэнтычнасці тэхнічных прыёмаў выканання з іншымі эстампамі, можна выказаць здагадку, што гравюры гэтай серыі былі створаны ў сціслы перыяд на пачатку 1800-х гг., незадоўга да скону мастака.

На некаторых эстампах рэлігійнай тэматыкі Я.Лапацінскі зрабіў надпіс: "*...dla swoich włościan*" ("для сваіх сялян". – *У.Р.*). Суправаджаючы працы гэтым надпісам, гравёр дакладна вызначаў кола спажыўцоў сваёй мастацкай прадукцыі і тым самым абмежаванасць тыражу і сферы распаўсюджвання ў межах сваёй вотчыны. З практычнага боку гэта вызваляла яго ад цэнзурных фармальнасцей. Стварэнне гравюры на метале ў глыбінцы Паўночна-Заходняй Беларусі было з'явай неардынарнай і ў культурна-пазнавальным аспекце – прагрэсіўнай. Дакладна пазначаная мастаком адраснасць твораў з'яўляецца дадатковым аргументам у вызначэнні віду эстампаў па функцыянальнай прыкмеце. Нават улічваючы іх колькасную абмежаванасць, гэта – "народная карцінка".

Беларуская народная карцінка, або лубок, – частка гісторыі нацыянальнага, графічнага мастацтва, адна з найбольш распаўсюджаных формаў выяўленчай народнай творчасці ў XVI–XIX стст. у славянскім свеце. Гэта – станковая гравюра рэлігійнага або іграевога зместу, створаная народнымі майстрамі або майстрамі гравіравальнай справы пры друкарнях і прызначаная для шырокага распаўсюджвання сярод народных мас. Нарадзіўся лубок у плыні старога сярэднявечнага рэлігійнага мастацтва і распаўсюджваўся як у выглядзе арыгінальных малюнкаў, так і ў тыражных тэхніках: дрэварыту, медзярыту, афорту, літаграфіі і інш. На ўсіх этапах свайго развіцця народная гравюра выпрацоўвала сваю характэрную вобразнасць і стылістыку, удасканальвалася ў тэхналогіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэагавала на духоўныя запатрабаванні часу, падвяргалася розным уплывам, запазычванням тэм, сюжэтаў, нярэдка паўтарала чужыя арыгіналы.

На Беларусі старажытных народных эстампаў захавалася вельмі мала, часта ў фрагментарным выглядзе. Пэўнае ўяўленне аб беларускім лубку сакральнага зместу, выкананым у тэхніцы абразнога дрэварыту, даюць графічныя аркушы, якія ў свой час набыў Іван Луцэвіч для створанага ім Беларускага музея ў Вільні [5]. На адной з іх пазначана аўтарства: Павел Комар (мастак Супраслеўскай друкарні). Дарэчы, падпісваць аўтарства народнай гравюры пачалі з XVIII ст., раней аўтарская пазіцыя нівеліравалася і выяўлялася толькі ў адметнасцях почырку мастака. У дадзеным выпадку своеасаблівасць адметная ў характэрнай ідэалізаванасці персанажаў, лапідарнасці сюжэта і святочна-дэкаратыўным аздабленні, што ўказвае на фальклорны пачатак вобразаў.

Значную ролю ў гісторыі беларускай культуры сярэднявечнай эпохі, у тым ліку і вырабу масавай друкаванай прадукцыі, адыгралі манастырскія друкарні. Супраслеўская – самая буйная беларуская друкарня XVIII ст. [14, с. 79–82]. Акрамя кніжнай прадукцыі тут выпускаліся абразкі для простага непісьменнага народу (напрыклад, вобраз Багародзіцы перамаляваны з іконы Супраслеўскай Багародзіцы). Трэба заўважыць, што ў адрозненні ад гравюр таксама супраслеўскага майстра Лявона Тарасевіча, якія змешчаны ў шыкоўных на той час выданнях, танныя эстампы "для народа" рабіліся разбярамі-самавукамі. У іх аздабленні адчуваецца ўплыў маскоўскай кніжнасці і запазычванне арнаментыкі ўкраінскай і польскай друкаванай кнігі [6].

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. народная карцінка склалася ў самастойную мастацкую з'яву ва ўсходнеўрапейскай культуры. Гэта быў час росквіту народнай гравюры на медзі. Характэрнай рысай было тое, што "афіцыйнае царкоўнае мастацтва становіцца ілюзорным, нясе рысы акадэмічнай халоднасці, а ў творах, прызначаных для народных патрэб, праяўляецца імкненне да сентыментальнасці і натуралістычнасці" [1]. Гэтыя рысы адбіліся і на творчасці самадзейных мастакоў-адзіночак з заможнага саслоўя беларуска-літоўскай шляхты.

Гравюры Я.Лапацінскага з'яўляюцца таксама рэдкімі экспанатамі аматарскай графікі, якія выкананы ў тэхніцы медзярыту. Па стылістыцы яны моцна адрозніваюцца ад вышэйузгаданых дрэварытаў. Вобразны строй медзярытаў Я.Лапацінскага, які імкнуўся да выяўленчай апавядальнасці, апісальнасці, трэба шукаць у эстэтыцы тагачаснай кніжнай ілюстрацыі. Тэхналогія вырабу гравюр звязана з друкарскай справай і патрабуе складанага абсталявання, таму іх аўтарамі былі часцей майстры, якія працавалі ў гэтых майстэрнях.

Гравюра "Ісус Хрыстос" – адзін з найбольш пачуццёва выразных вобразаў разца Я.Лапацінскага. У ім увасобіліся не толькі асабістыя пачуцці аўтара, але і шматвяковы мастацкі вопыт. З абраза Хрыста пачынаецца гісторыя іканапісу. Адпаведна хрысціянскай традыцыі першая выява Хрыста была дзівосным чынам створана самім Хрыстом (нерукатворная выява Хрыста на плашчаніцы). Іканаграфія Хрыста вызначаецца вялікай разнастайнасцю тыпаў выяў і багац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цем псіхалагічных адценняў, якія закладзены ў кожнай з іх. Выяву Хрыста, гравіраваную Я.Лапацінскім, можна аднесці да аднаго з найбольш распаўсюджаных іканаграфічных тыпаў – Пантакратара (ад. грэч., азначае Уседзяржыцель). Гэта – найбольш універсальная выява Хрыста як носьбіта Божай і чалавечай сутнасці ў непарыўным гарманічным адзінстве; Хрыстос прадстаўлены ў аблічча, якое царкоўныя традыцыі адносяць да апісання відавочцаў. Вобраз Ісуса Хрыста ў гравюры Я.Лапацінскага прыцягальны сваёй пачуццёвай даступнасцю і адкрытасцю кожнаму чалавеку. Гэта адчуваецца ў спакойным добрым позірку, павольнай пластыцы кісці правай рукі, пальцы якой быццам у руху складаюцца ў знак малення. Ракурс галавы знізу, касмічна-цёмны фон, дынамічныя рыскі адкінутых назад пасмаў валасоў, фрагмент крыжа – сімвалічныя дэталі, якія ўзвышаюць вобраз над штодзённай мітуснёй, надаюць яму рысы рамантычнасці.

Глыбока асабістае пачуццё звязана з вобразам Божай Маці. Па паданні, першы абраз Божай Маці – узнёслае адлюстраванне жанчыны, якая прыхілілася да сына ("Пуцевадзіцельніца"), быў напісаны евангелістам Лукой. У ім адлюстравалася спалучэнне рэальнасці духоўнай і рэальнасці гістарычнай. Духоўнай рэальнасці можна дасягнуць толькі праз асабісты жыццёвы вопыт, а захаванне гістарычнай рэальнасці забяспечвае сацыяльны вопыт, увасоблены ў вобразах, створаных на працягу многіх стагоддзяў. Гравюра Я.Лапацінскага "Божая Маці" ў іканаграфічнай структуры адпавядае тыпу "Усіх тужлівых радасць". Адметная аўтарская рыса гравюры праявілася ў пачуццёвай напоўненасці вобраза. Няўцешны смутак Маці Божай – простае чалавечае пачуццё, якое не патрабуе ўпрыгожвання знешняй патэтыкай поз і жэстаў [3, с. 24].

Сюжэт гравюры "Святое сямейства" – амаль бытавая сцэна. Персанажы: Дзева Марыя з немаўляці, яе муж Іосіф Абручнік і праведная Елісавета – у большай ступені нагадваюць вобразы простых людзей з зямнымі радасцямі і турботамі, чым вобразы біблейскіх святых. Кампазіцыя з чатырох фігур пабудавана ў крузе проста і арыгінальна. Усе твары персанажаў, вылучаныя святлом, знаходзяцца на адной гарызанталі, і толькі выява Маці Божай Марыі злёгку дамінуе. У спалучэнні з вертыкальнымі лініямі калоны яны ствараюць крыжападобную схему сілавой лініі кампазіцыі з выявай у цэнтры мадонны з дзіцем.

Гравюры "Св. пакутнік Інакенці" і "Тры пакутнікі" ўслаўляюць ратныя подзвігі герояў, сцвярджаюць ідэю непазбежнай перамогі духа ў справядлівай барацьбе, нават цаною жыцця. У абедзвюх гравюрах маецца сімвал масонскага руху – "Прамяністая дэльта" (вока ў трохкутніку) – знак бога-архітэктара. Гэты сімвал запазычаны з хрысціянскага сімвала прадбачання – "Усёвідушчае вока", дзе трохкутнік сімвалізуе Святую Троіцу. Мажліва, з'яўленне гравюр нейкім чынам звязана з членствам Я.Лапацінскага ў мясцовай масонскай ложы. Сюжэтны матыў гравюры "Св. пакутнік Інакенці" – укленчаны воін. Алегорыя сцэны лёгка прачытваецца: воін, асвечаны прамянямі, што зыходзяць на яго з нябёсаў, дзякуе Усявышняму за свой лёс. Меч і лаўровы вянок пераможцы, якія ля-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаць ля цякучага ручая і зламанага, але яшчэ жывога дрэва, – знак параможнага заканчэння бітвы і вяртання жыцця да мірнай плыні. Мабыць, жадаючы падкрэсліць дачыненне гэтага біблейскага сюжэту да гістарычнага лёсу Рэчы Паспалітай, мастак фіксуе ў подпісе факт пахавання цела пакутніка Інакенція з ампулай крыві ў Дрысвяцкім парафіяльным касцёле ў 1803 г. (зараз в. Дрысвяты Мядзельскі раён). Сюжэт другой гравюры падобны да папярэдняй. Ён адлюстроўвае сцэну заканчэння бою, калі героі сюжэта аддаюць даніну пакорлівасці і ўдзячнасці Богу. Надпіс пад выявай удакладняе імёны пакутнікаў і сведчыць, што "іх рэліквіі ў 1803 г. захаваны ў капліцы ў Шаркаўшчыне".

Рэдкія экземпляры друкаванага народнага лубка, у тым ліку і асобныя гравюры Я.Лапацінскага, якія захаваліся да нашага часу, сведчаць аб тым, што развіццё беларускай народнай гравюры ў трактоўцы сюжэта, у стылі і тэхніцы ў большасці адпавядаюць асноўным эвалюцыйным характарыстыкам выяўленчага мастацтва. Яны маюць відавочныя сувязі з польскай і рускай народнай гравюрай. Эстампы, выкананыя самадзейнымі майстрамі, вызначаюцца шчырасцю, непасрэднасцю, наіўнай мудрасцю і прастатой. Своеасаблівасці сюжэтна-вобразнага строю і стылістыкі выканання гравюр Я.Лапацінскага звязваюць іх з традыцыйнымі народнымі карцінкамі характэрнымі рысамі: прэваліраванне шырока распаўсюджаных біблейскіх кананічных сюжэтаў і вобразаў; набліжэнне да бытавой трактоўкі сакральных сцэн; простая, нават наіўная пластыка іканаграфічных выяў.

***

Жыццё і творчая дзейнасць характарызуюць Я.Лапацінскага як выбітнага прадстаўніка беларускай шляхты, асобу неардынарную, шматгранную, надзеленую прыроднымі мастацкімі здольнасцямі. Яго творчая спадчына паўстае перад сучаснымі даследчыкамі каштоўным іканаграфічным матэрыялам аматарскага гравіравання, які ў пэўнай ступені дае ўяўленне аб стане беларускага графічнага мастацтва канца XVIII – пачатку XIX ст. Гравюры Я.Лапацінскага з'яўляюцца цікавай інфармацыйнай крыніцай тагачаснага культурнага жыцця на Беларусі. Цэнтральнае месца ў творчасці мастака займала сакральная і фамільная тэматыка, якая ўвасобіла не толькі мастацкія густы і эстэтычныя прыхільнасці асяродку заможнай беларускай шляхты, але і народны характар вобразнага светаўспрымання. Імкненне пераадолець прымітывізм і наблізіцца да натуральнага падабенства ў адлюстраванні свету, авалодаць прагрэсіўнай на той час тэхнікай гравіравання на медзі сведчыць аб намаганнях беларускай творчай інтэлігенцыі да засваення перадавых культурных набыткаў еўрапейскага мастацтва. Аматарская творчасць Я.Лапацінскага храналагічна супала з пачаткам новага этапу ў развіцці беларускай графікі, калі на арэну мастацтва ўступалі прафесійна падрыхтаваныя гравёры Віленскай мастацкай школы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА


1. *Алексеева, М.А.* Русская народная картинка. Некоторые особенности художественного явления / М.А.Алексеева // Народная картинка XVII–XIX веков: материалы и исследования. – СПб., 1996. – С. 3–13.

2. *Грыцкевіч, А.П.* Беларуская шляхта / А.П.Грыцкевіч // Спадчына. – 1993. – № 1. – С. 11–16.

3. *Иконные* образцы XVII – начала XIX в. Иконография Богоматери и Богородичные праздники / предисл. и сост. З.П.Морозовой. – М.: Гос. ист. музей, 1993. – 24 с.

4. *Кацер, М.С.* Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода: очерки / М.С.Кацер. – Минск: Наука и техника, 1969. – 204 с.

5. *Кулік, Я.* Беларускі народны дрэварыт / Я.Кулік // Помнікі гісторыі культуры Беларусі. – 1989. – № 2.

6. *Лабынцаў, Ю.А.* Графіка беларускіх выданняў Супрасля / Ю.А.Лабынцаў // Помнікі гісторыі культуры Беларусі. – 1989. – № 2. – С. 28–32.

7. *Лапацінскі Ян* // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993–2003. – Т. 4. – С. 334.

8. *Памяць:* гісторыка-дакументальныя хронікі Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск: БЕЛТА, 2004. – 512 с.: іл.

9. *Рынкевіч, У.* Станаўленне прафесійнай мастацкай адукацыі на Беларусі / У.Рынкевіч // Мастацкая адукацыя і культура. – 2005. – № 3. – С. 36–42.

10. *Рынкевіч, У.* Станаўленне беларускай прафесійнай графікі / У.Рынкевіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2004. – № 3. – С. 57–60.

11. *Хмяльніцкая, Л.* Лапацінскія / Л.Хмяльніцкая // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 332.

12. *Шауро, Г.Ф.* Развитие народного изобразительного искусства Беларуси конца XVIII – начала XXI в.: историко-теоретический аспект: автореф. дис. … д-ра искусствоведения (17.00.09) / Г.Ф.Шауро. – Минск: БГУКИ, 2009. – 44 с.

13. *Швед, В.В.* Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.) / В.В.Швед. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 410 с.

14. *Шматаў, В.Ф.* Мастацтва беларускіх стaрадрукаў XVI–XVIII стагоддзяў / В.Ф.Шматаў. – Мінск: Тэхналогія. – 2000. – 132 с.

15. *Ярашэвіч, А.* Роспісы Будслаўскага касцёла / А.Ярашэвіч // Наша вера. – 2001. – № 2. – С. 22–26.

16. *Białynicka-Birula, J.* Łopaciński Jan Nikodem / J.Białynicka-Birula // Słownik artystow polskish (SAP). – Warszawa: wyd. KRĄG, 1993. – T. 5. – S. 174–175.

17. *Słownik* rytowników polskich / J.Kołaczkowski. – Warszawa, 1874. – S. 36.

18. *Polski* słownik biograficzny (PSB). – Wroclaw, 1973. – T. 18. – S. 392 – 404.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*19. Pomniki* rytownictwa krajowega / odciski z blach mniejszych, znajdujących się w biblijotece Łohojskiej Konstantego Hrabi Tyszkiewicza. Wydane nakladam właśżciciela. – Wilno: drukiem A.Marcinowskiego, 1858. – S. 36: il. 179.

*20. Rastawiecki, E.* Słownik rytowników polskich w Polsce osiadłych lub czasowo w niej pracujących / E.Rastawiecki. – Poznań, 1886. – S. 185.

*21. Słownik* geograficzny królestwa połskiego. – Warszawa, 1890. – T. XI. – S. 980.

*22. Spis* rycin w zbiorze Emeryka Hrabrego Hutten-Czapskiego w Krakowie. – Kraków, 1901. – S. 175.

*23. W kręgu* wileńskiego klasycyzmu: katalog wystawy / [pod kierukiem E.Charazińskiej i R.Bobrowa]. – Warszawa, 2000. – S. 344.

*24. Wittyg, Wiktor*. Exlibrisy bibliotek polskich XVII–XVIII veków / Wiktor Wittyg. – MCMIII. – S. 47–48.

*25.* http://spadchyna.xivik/info/modules.php?name=News&file=article&sid=84

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СПІС ІЛЮСТРАЦЫЙ ТВОРАЎ Я.ЛАПАЦІНСКАГА
(на ўклейцы)

Аўтапартрэт скульптара. *Медзярыт*
Партрэт Лапацінскай з Агінскіх. *Медзярыт*
Ян Нікодэм з Лапаціна Лапацінскі. *Медзярыт. 13,9 ´ 8,7*
Партрэт Тадэвуша Касцюшкі. *Медзярыт*
Святое сямейства. *Медзярыт*
Маці Божая. *Медзярыт*
Ісус Хрыстос. *Медзярыт*
Тры пакутнікі. *Не раней за 1803 г. Медзярыт*
Святы пакутнік Інакенці. *Не раней за 1803 г. Медзярыт*

ІЛЮСТРАЦЫІ (па тэксту)

Герб "Любіч"
Мікалай Тадэвуш Лапацінскі. *Гравюра невядомага аўтара*
Сядзібны дом Лапацінскіх у Лявонпалі. *Фота 2010 г.*
Траецкая царква ў Лявонпалі. *Фота 2010 г.*
Ян Нікодэм Лапацінскі. *Гравюра невядомага аўтара*
Сар'янскі касцёл. *Фота 2010 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Д а д а т а к**

## РОД ЛАПАЦІНСКІХ ГЕРБА "ЛЮБІЧ"

*Матэрыял сабраў і апрацаваў Уладзіслаў Ляскоўскі*

Род Лапацінскіх бярэ свой пачатак з Лапаціна, што на Мазоўшчыне. У XV ст. Багдан Лапацінскі атрымаў надзел пад Мсціслаўлем, а яго сын Юзаф заклаў там маёнтак, названы Лапацінам. Тут гэты род пратрымаўся тры стагоддзі. У 1579 г. Вялікі князь Баторый надзяліў зямлёй Базыля Лапацінскага. Луке Лапацінскаму, ротмістру мсціслаўскаму, у 1683 г. быў нададзены графскі тытул і грамата Рымскага імператара Леапольда I.

Шырока разгалінаваны род Лапацінскіх быў параднёны са знакамітымі родамі Борхаў, Гласкоў, Кяневічаў, Корсакаў, Мірскіх, Манюшкаў, Неміровічаў, Незабытоўскіх, Агінскіх, Аскеркаў, Пацаў, Плятэраў, Рудамінаў, Сапегаў, Тышкевічаў, Валовічаў, Жабаў.

Найбольшую вядомасць роду Лапацінскіх надалі тры сыны Лявона Лапацінскага (1663–1732): Ян Дамінік (1709–1778) – біскуп жамойцкі; Ігнацы Блажэй (1722–1766) – суддзя браслаўскі і пісар скарбовы ВКЛ, літаратар; Мікалай Тадэвуш (1715–1778) – староста мсціслаўскі, ваявода берасцейскі і пасол сейму.

Мікалай Тадэвуш у 1742 г. набыў у Сапегаў маёнткі Сар'я, што ў Дрысенскім павеце, і Ёды ў Браслаўскім павеце, у 1745 г. – маёнтак Чурылавічы (зараз Міёрскі раён), назваўшы яго Лявонпалем у гонар бацькі, Лявона. У 1750 г. Мікалай пабудаваў у Лявонпалі белы мураваны палац, які часткова захаваўся да нашых дзён. У маёнтку была арганізавана апрацоўка лёну, выпуск тканін, вытворчасць капелюшоў і сукна. Палац меў значэнне мясцовага цэнтра культуры. Тут меліся багатая бібліятэка, друкарня, даследна-навуковыя кабінеты, карцінная галерэя, у фондах якой нават былі чатыры арыгіналы Рубенса, фламандскія нацюрморты, англійскія марыны, узоры антычнага мастацтва. У аранжарэі вырошчваліся ананасы, апельсіны, лімоны.

У 1753 г. Мікалай Тадэвуш набыў маёнтак у Шаркаўшчыне. У 1770 г. Шаркаўшчыну пераняў ад бацькі яго сын Ян Нікодэм, што займаў пасаду старосты гродавага мсціслаўскага. Тут, у маляўнічым месцы на беразе ракі Янкі ён абаснаваў сваю рэзідэнцыю. На працягу 1770–1776 гг. збудаваў палац мураваны двухпавярховы, капліцу каталіцкую, заклаў парк, сажалкі, аранжарэю, цяпліцу, звярынец. Палац і капліца ў асноўным захаваліся да нашых дзён (так званы Красны Двор). Палац памерам 10×20 м з 1939 г. стаў уласнасцю дзяржавы, выкарыстоўваўся як клуб, пасля Другоў сусветнай вайны – кантора МТС, а з 1953 г. перабудаваны ў жылы шасцікватэрны дом, пры гэтым будынак страціў прыгожы балкон. Цагляная капліца мела памеры 8×12 м. Захаваўся прыгожы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

касцёльны партал, арачныя вокны. У пасляваенны час выкарыстоўваўся пад стайню. Захаваліся рэшткі парку і сажалкі.

У 1776 г. Ян Нікодэм пабудаваў ў мястэчку Новая Шаркаўшчына (правы бераг Дзісенкі) уніяцкую драўляную царкву Беззаганнага Зачацця Дзевы Марыі, даўшы фундуш у 8000 злотых і 15,5 дзесяцін зямлі. Менавіта ў гэтай царкве фундатар знайшоў свой апошні прыстанак. Пазней, у 1897 г., царква была перабудавана на мураваную праваслаўную. Апроч таго, у 1780 г. Ян Нікодэм вылучыў 4000 злотых польскіх на аднаўленне царквы ў Старой Шаркаўшчыне на левым беразе р. Дзісенкі, якая была пабудавана з фундацыі Льва Сапегі ў 1639 г. Таксама прыдадзеную царкве вёску Тычкова змяніў на вёску Альхоўцы, якая была размешчана побач.

19 сакавіка 1794 г. Ян Нікодэм купіў за 2100 тысяч злотых польскіх у М.К.Агінскага мястэчка Дрысвяты (зараз Браслаўскі раён). Вядома, што ў 1846 г. маёнткам у Дрысвятах валодаў ягоны нашчадак Антон Лапацінскі. Дачка Антона Ганна за падтрымку паўстання ў 1864 г. была выселена ў Тамбоўскую губерню, а перад гэтым маёнтак прадала.

Брат Мікалая Тадэвуша Ігнацы Блажэй, пісар скарбовы ВКЛ, прыняў ад Міколы маёнтак Ёды. У 1754 г. разам з жонкай Юдытай (з Прозараў) фундавалі ў Ёдах будаўніцтва царквы. Таксама збудавалі фальварак Юдыцына (у гонар Юдыты) і там жа царкву.

У 1794 г. маёнтак Ёды падзялілі на 4 часткі паміж сынамі Ігнацыя. Марцін узяў мураваны палац ў Ёдах. Юзаф заклаў фальварак Паўлінова (у гонар жонкі Паўліны), фундаваў касцёл у Барадзінічах, дзе потым адбывалася пахаванне Лапацінскіх. Тадэвуш заклаў два фальваркі: Тадулін (назва – ад свайго імя) і Ганова (назва ад імя жонкі Ганны). Малодшы брат Мікалай атрымаў Юдыцына і побач заклаў фальварак Мікалаёва (назва – ад свайго імя). І цётачны брат Рафал Свянціцкі заклаў на ўчастку Юзафа фальварак Рафалова.

З часу далучэння нашага краю да Расійскай імперыі пачаўся ўціск беларускай шляхты – тутэйшай эліты. Характэрная з'ява для таго часу – судовая валтузня супраць Юзафа Лапацінскага з 1829 па 1838 г. за тое, што пабудаваў касцёл у Барадзінічах. Нагодай да закрыцця касцёла стала тое, што будынак размяшчаўся паблізу ўніяцкіх могілак, дзе раней была ўніяцкая царква. У плыні русіфікацыі нашага краю ўлады ўсяляк навязвалі рускую праваслаўную царкву і ўводзілі разнастайныя абмежаванні дзейнасці каталікоў. Лапацінскім удалося дабіцца права мець на сваёй зямлі сямейную капліцу, аднак без права здзяйсняць абрады. Быў устаноўлены паліцэйскі нагляд за выкананнем прысуду. Род Лапацінскіх выкарыстаў пустуючы касцёл для пахаванняў *(Наыянальны гістарычны архіў Беларусі – НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 932).*

У 1813 г. памёр Тадэвуш – уладальнік Тадуліна і Ганова. Удава Ганна з Гленкаў Лапацінская звярталася з прашэннем да імператара аб прызначэнні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апякунства над маёнткам Ганова, спасылаючыся на адпаведныя артыкулы Статуту Вялікага Княства Літоўскага, які тады яшчэ дзейнічаў на гэтай тэрыторыі. Вось частка таго звароту з перапіскі 20–29 красавіка 1830 г.: "Всемилостивейший, державнейший Великий Государь Император Александр Павлович, Самодержец Всероссийский, Государь всемилостивейший, просит поверенный помещицы Анны с Гленков Лопатинской, адвокат Иван Климентович о нижеследующем:

В 1796 г. Фадей (Тадевуш. – *У.Л.*) Лопатинский при вступлении в брак в имениях отца, заключающих в себе 2627 душ мужских, получил 328 душ и по силе Статутового права артикула 2-го с раздела 5-го учинил реформацийную запись в 1790 году, которую и признал в Виленском гражданском суде, обеспечив на бывшее неразделенным тогда между его братьями имение Иоды, ни той части, которая по разделе из оного имения причитается…" *(НГАБ. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 261).*

Вялікі маёнтак Шаркаўшчына (14700 дзесяцін зямлі і 2000 душ муж.) нядоўга квітнеў за Лапацінскімі. З захопам краю Расійскай імперыяй ён, як і іншыя буйныя маёнткі, хутка разарыўся і пачаў распадацца. У 1801 г. ад маёнтка Шаркаўшчына адпалі за няплаты 20 фальваркаў. За Лапацінскімі засталіся толькі сам двор (Красны Двор) ды фальваркі Юзэфава, Хіны і Станіслававa. У 1807 г. Уладзіслаў Лапацінскі перадаў двор і фальварак Юзэфава сыну Тамашу, віцэ-маршалку дзіснянскаму, а Хіны – сыну Юзафу. Тамаш у 1814 г. сваю частку прадаў Матэвушу Багуцкаму.

Наканаванай падзеяй для роду стала паўстанне 1831 г., у якім Лапацінскія прынялі актыўны ўдзел. Завадатарамі паўстання ў Дзіснянскім павеце былі браты Ігнацыя (дзіснянскага павятовага маршалка, правадыра дваранства) Станіслаў і Людзвіг з маёнтка Ганова. Людзвіг Лапацінскі загінуў у баі за Дзісну. Станіслаў быў прыгавораны да пакарання смерцю (дакументальнага пацвярджэння аб выкананні прысуду не знойдзена. – *У.Л.*). Апроч іх, у паўстанні ўдзельнічалі і панеслі пакаранні граф Аляксандр з Юдыцына з партыяй пяхоты, граф Марцін з Ёд з пяхотай, граф Юзаф (Иосиф) з Рафалова з пяхотай (памёр у выгнанні ў Францыі ў 1853 г.), граф Ігнацы, маршалак дзіснянскі – палкоўнік на кані, граф Лапацінскі з Варонкі – палкоўнік на кані, граф Лапацінскі з Багданава і Паяныч, граф Лапацінскі з Забеліна, граф Казімір з Рафалова (памёр у выгнанні ў Францыі ў 1859 г.).

Актыўным аргнізатарам паўстання 1831 г. быў Аляксандр Лапацінскі, сын Марціна з Ёд, член Віленскай адукацыйнай камісіі. Няўлоўны Аляксандр доўга расшукваўся паліцыяй, быў завочна прыгавораны да пакарання смерцю. Ён загінуў у баі на валах Варшавы *(НГАБ. Ф. 299. Воп. 1. Спр. 1188).* У спісе дваран за 1832 г. значыўся адзіны Лапацінскі – Ігнацi Фёдаравіч з Тадуліна. Яму, памілаванаму, 21 верасня 1832 г. "за отличную службу" надалі званне калеж-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага сакратара Двара яго Імператарскай Вялікасці камерюнкера (ніжэйшае прыдворнае званне. – *У.Л.*). З архіўных крыніц вядома, што на час, калі Аляксандру споўніўся 41 год, ён быў абраны дзіснянскім маршалкам, сыну Вільгельму (будучаму паўстанцу 1863 г. – 7 гадоў, дачцэ Ганне – 8 гадоў, сыну Канстанціну – 5 гадоў, сыну Ігнацію – 2 гады). Меў 257 душ мужчынскіх *(НГАБ у Гродна. Ф. 1626. Воп. 1. Спр. 4).*

Лапацінскія ўдзельнічалі і ў паўстанні 1863 г. Сярод іх: Лапацінскі Ігнаці (Иосифович) (уладальнік маёнткаў Сар'я і Лявонпаль), Лапацінская Ганна з Дрысвят. Асабліва вылучыўся Вільгельм Ігнатавіч з Тадуліна. Легендарны герой паўстання пацярпеў паразу каля вёскі Дубавое (паблізу Шаркаўшчыны). Узброены двума пісталетамі, Вільгельм змог прабіцца праз атрад стараавераў з Корніцы і суседніх вёсак, які дзейнічаў на баку царскіх войскаў. Няўлоўны Вільгельм доўга расшукваўся паліцыяй. Існуюць легенды, як ён, уцякаючы ад паліцыі, змог, дыхаючы праз саломіну, двойчы пераплыць Дзвіну пад вадой і знікнуць бясследна. У маёнтку Бяльмонты, пераапрануўшыся ў лакея, прыслужваў высокім гасцям пана і слухаў, як яны забаўляюцца расповедамі пра яго няўлоўнасць. Сам цар займаўся яго справай. Ладзіліся аблавы нават на цэлы павет, але яму заўсёды ўдавалася ўцячы. Эмігрыраваў у замежжа. Яго маёмасць (1/3 доля маёнтка Тадулін) была канфіскавана.

Малодшы брат Вільгельма, Ігнаці, служыў у царскай арміі з 1849 г. па 1857 г., у 1853–56 гг. – у Крыму, удзельнік Крымскай вайны. Узнагароджаны бронзавым медалём на Андрэеўскай стужцы. Меў у маёнтку 345 сялян, жанаты з Ганнай Паўлаўнай, дачкой стацкага саветніка Шчэпкіна. За жонкай маёмасці не лічылася. У 1857 г. звольніўся з арміі па сямейных абставінах і накіраваўся на службу ў Арлоўскую губерню, адтуль – у Маскву. Пераведзены ў тытулярныя саветнікі (1863), у калежскія асэсары (1865). Памёр 24 ліпеня 1867 г. Застаўся сын Сяргей нараджэння 8 красавіка 1866 г. Удава хадайнічала ў Дзіснянскім паветовым судзе аб спадчыне сына Сяргея *(НГАБ у Гродна. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 930).*

Па вопісе маёнткаў 1838 г. за Лапацінскімі і іх нашчадкамі лічыліся:

– фальварак Тарзянова (Тэрэзьянов), які належаў Тамашу (Фаме) і Ізабэле Лапацінскім. Да фальварка адносіліся вёскі Сасноўцы (Саснова) з 65 душамі мужчынскімі і 72 жаночымі, Валожанки (Вожонки) – адпаведна 35 і 41 душа, Крапіўнікі – 15 і 17 душ;

– двор Тадулін (46 і 51 душа) Ігнація Лапацінскага, вінзавод і вёскі Корніца (62 і 68 душ), Шурпакі (Шарпакова) (43 і 51 душа), Корсакі (Амбразёнкі) (34 і 43 душы), Касьцікава (45 і 49 душ), Прошкі (25 і 32 душы);

– двор Ганова (2 і 3 душы) Станіслава Лапацінскага, вёскі Глісьцёнкі (51 і 57 душ), Шурпакі (17 і 20 душ), часткова Амбразёнкі (29 і 38 душ), Бемабродзе (10 і 14 душ);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– двор Ёды Марціна Лапацінскага, царква грэка-ўніяцкая, вінзавод (65 і 73 душы);

– вёскі Падобы (46 і 52 душы), Лакінаўцы (35 і 41душа), Бернаты (18 і 23 душы), Камона (Вінніца) (27 і 34 душы), Воўча Воля (9 і 11 душ), Залессе (48 і 57 душ), Весялова (20 і 28 душ);

– двор Юдыцын (7 і 9 душ) Аляксандра Лапацінскага, грэка-ўніяцкая царква, вінзавод, вёскі Мачкі ( 27 і 31 душа), Селакузчы (261 і 273 душы), Свілы (98 і 104 душы);

– двор Рафалова (7 і 9 душ) Юзафа (Иосифа) Лапацінскага, касцёл, вінзавод, 22 вёскі: Гізаўцы (ці Гізаўшчына) (46 і 57 душ), Рэпішча і Снегі (82 і 91 душа), Варонка (82 і 91 душа), Буеўшчына (34 і 44 душы), Буйкі (3 і 2 душы) і інш. (цяпер у Браслаўскім раёне);

– двор Давяты Івана Лапацінскага, 4 вёскі (разам 39 і 50 душ) (цяпер Браслаўскі раён).

Нашчадкам памянутага Ігнація з Ганова быў Баляслаў Лапацінскі, які праславіўся ў свецкіх колах Вільні сваёй дасціпнасцю і жартамі. У XIX ст. вылучыліся Аляксандр (памёр у 1917 г.) і яго сын Генрык Лапацінскі з Ёд сваім сяброўствам з родзічам Фелікса Дзяржынскага. У царскі час Фелікс хаваўся ў Ёдах ад паліцыі, а ў 1919 г. даў Генрыку ахоўную грамату, якая яго ратавала ад рэпрэсій у 1939–1941 гг. Але ж у час Вялікай Айчыннай вайны (1942) партызаны спалілі сядзібу, а разам расправіліся з суседам і сваяком Генрыка Юзафам Лапацінскім з Устроні, а таксама са сваяком Тадэвушам Пяркоўскім, былым генеральным камісарам Рэчы Паспалітай у Гданьску.

Сын Сяргея Лапацінскага (Тадулін і Ганова) Ежы Лапацінскі ( 1900–1964) абаснаваўся ў Ганове, а сястра яго Яўгенія – у Тадуліне. У 1939 г. Ежы з сям’ёй выехаў у Вільню, а потым у Варшаву. Сын Ежы, Крыштаф 1945 г. нараджэння, жыве ў Варшаве, працуе ў турыстычным клубе “Unikal” (*паводле звесткі Гжэгажа Рэнкоўскага*).

## РАДАВОД ЛАПАЦІНСКІХ
(пакаленні Шаркаўшчынскай мясцовасці)

1. Лявон Лапацінскі.

2. Сыны Лявона: Ян Дамінік (1709–1778), Мікалай Тадэвуш (1715–1778), Ігнацы Блажэй (1722–1766).

3. Сын Мікалая – **Ян Нікодэм** (1747–1810). Сыны Ігнацыя Блажэя: Тадэвуш (1762–1814), Марцін (1760–1850), Юзаф (1770–?), Мікалай.

4. Дзеці **Яна Нікодэма**: Юзаф (1766–?), Тамаш (1775–?), Уладзіслаў, Антон, Анэля (1776–?), Юзэфа (1778–?), Ізабэла (1784–?).

Дзеці Тадэвуша Ігнацьевіча: Ігнацы Станіслаў (1791, або 1802–1841), Станіслаў, Людзвіг (?–1831), Ізабэла. Сын Марціна Ігнацьевіча Аляксандр



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(1791–1831). Сыны Юзафа Ігнацьевіча: Казімір (?–1859), Іосіф (?–1855). Сын Мікалая Ігнацьевіча Аляксандр.

5. Сын Тамаша Янавіча Юзаф (Иосиф) (1772–1853). Сыны Уладзіслава Янавіча: Тамаш, Юзаф. Дзеці Антона: Ганна, Іван.

Дзеці Ігнацыя Тадэвушавіча: Вільгельм (1825 або 1827–?), Канстанцін (1827–?), Ігнаці Адам (1830 або 1831–1867), Ганна (1824–?).

Сын Аляксандра Марцінавіча Генрык Казімір (1823–?).

6. Сын Юзафа (Иосифа) Тамашавіча Ігнаці.

Сын Ігнація Ігнацьевіча Сяргей (1866–1934).

Сын Генрыка Аляксандравіча Аляксандр (1848–1917), кузен Ф.Дзяржынскага.

7. Дзеці Сяргея Ігнацьевіча: Ежы (1900–1964), Яўгенія.

Сын Аляксандра Генрыкавіча Генрык (?–1954)

8. Сын Ежы Сяргеевіча Крыштаф.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРНЫЯ І АРХІЎНЫЯ КРЫНІЦЫ

*1. Hedemann, Otton.* Historja powiatu Braslawskiego / Otton Hedemann. – Wilno, 1930.

*2. Slownik* Geograficzny. – Warszawa, 1890.

*3. Нацыянальны* гістарычны архіў Беларусі:

Ф. 299. Воп. 2. Спр. 880, 2017, 2078, 1341, 1376, 1666, 1410, 2265, 261.

Ф. 299. Воп. 1. Спр. 932, 1188.

Ф. 319. Воп. 1. Спр. 5.

Ф. 320. Воп. 1. Спр. 160, 73.

Ф. 320. Воп. 3. Спр. 64.

Ф. 561. Воп. 1. Спр. 1.

Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5240.

Ф. 1416. Воп. 3. Спр. 11058.

Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 3133.

4. *Нацыянальны* гістарычны архіў Беларусі ў Гродне:

Ф. 582. Воп. 1. Спр. 930.

Ф. 1626. Воп. 1. Спр. 1, 4.

Ф. 1626. Воп. 2. Спр. 1.

*5. Нарбут, А.Н.* Генеалогия Белоруссии / А.Н.Нарбут. – М., 1955. – Вып. 1–4.

*6. Сапунов, А.* Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / А.Сапунов и кн. В.Друцки-Любецкий. – Витебск, 1896.

*Навуковае выданне*

**Рынкевіч** Уладзімір Іванавіч

**ЯН ЛАПАЦІНСКІ**

Рэдактар В.В.Каташвілі
Тэхнічны рэдактар А.У.Гіцкая
Дызайн і вёрстка В.Н.Паўлаўца

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. .
Тыраж 250 экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*(4-я ст.вокладкі)*

Графіка XIX стагоддзя

**ЯН ЛАПАЦІНСКІ**

Ураджэнец паўночных зямель Беларусі, прадстаўнік старажытнага шляхецкага роду Лапацінскіх герба "Любіч". Непрафесійны мастак, гравёр па медзі, вядомы таксама ў гісторыі нашага краю як знаны дзяржаўны службовец Вялікага Княства Літоўскага. Яго мастацкая спадчына, гравюры рэлігійнай тэматыкі і правінцыяльны партрэт адлюстроўваюць развіццё аматарскай выяўленчай творчасці ў галіне друкаванай графікі і яе ўзаемасувязь з прафесійным мастацтвам Беларусі на пачатку XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ